**ЖЫЦІЕ́**, а г і я г р а ф і я, апісанне жыцця і дзейнасці духоўнай асобы, святога, пустэльніка, аднаго з айцоў царквы; жанр царк.-рэліг. л-ры. Героі Ж. павінны былі служыць прыкладам для веруючых. Творы выконвалі маральна-дыдактычную функцыю — навучалі царк. абрадам і правілам, выхоўвалі пакорлівасць, набожнасць, сціпласць, прапагандавалі жыццё паводле Боскіх запаветаў. Першыя агіяграфічныя творы на тэр. Беларусі з'явіліся ў 11 ст. з Візантыі праз пасрэдніцтва Балгарыі. Падзяляюцца на буйныя маральна-дыдактычныя (жыціі айцоў Васіля Вялікага, Макарыя Рымскага), антыерэтычныя («Жыціе Фёдара Студыта»), эсхаталагічныя («Жыціе Андрэя Юродзівага»), прыгодніцкія («Жыціе Яўстафія Плакіды»). Распаўсюджваліся ў выглядзе асобных кніг і ў спец. зб-ках — Пралогах і Чэццях-Мінеях. Першы арыгінальны ўсх.-слав. агіяграфічны твор «Казанне пра Барыса і Глеба» напісаны ў сярэдзіне 11 ст., з'явіўся асновай для «Жыція Барыса і Глеба». Першыя бел. агіяграфічныя творы — «*Жыціе Ефрасінні Полацкай*» і «Жыціе Кірылы Тураўскага» — створаны ў 12 ст. Прыблізна каля 1230—40-х гг. створана «*Жыціе Аўрамія Смаленскага*».

*В.І.Еўмянькоў.*

***Жыцень.*** *Малюнак В.Слаука. 2005.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова